# «На Саракі прыляцелі птакі...»

## Традыцыі святкавання Саракоў у беларусаў

Мы сённяшнія – гэта і тое, што было да нас. Падзеі, якія адбываліся, людзі, што ў іх удзельнічалі, продкі, ад якіх мы паходзім, – часцінка ўсяго гэтага хаваецца глыбока ў нас, у нашай падсвядомасці, за стагоддзі сфарміраваўшы душу народа, да якога мы належым.

У рубрыцы «Крыніцы» мы будзем разам з нашымі аўтарамі і чытачамі шукаць беларускія архетыпы і першаасновы, якія датычацца матэрыяльнай і духоўнай культуры нашай краіны, яе багатай гісторыі і старадаўніх традыцый, а таксама ўплываў на іх нашых блізкіх і далёкіх суседзяў і дачыненняў з імі.

Запрашаем у гэты таямнічы і яскравы свет кожнага, хто цікавіцца нашай мінуўшчынай.



Птушкі на Сараکі. Клімавіцкі раён, Магілёўская вобласць. Фота Т. Валодзінай.



**Таццяна Кухаронак,**
старшы навуковы супрацоўнік аддзела нарадазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
kucharonak@tut.by

Асноўнай крыніцай для беларускіх этнолагаў і фалькларыстаў у апошнія два дзесяцігоддзі сталі палявыя запісы, інфармацыя, атрыманая ад захавальнікаў і носьбітаў мясцовых традыцый падчас экспедыцыйнай працы. Любая навуковая экспедыцыя з'яўляецца камунікатыўнай структурай спараджэння ведаў і фарміруе шэраг тыпавых камунікатыўных сітуацый, якія вызначаюць і формы першаснай вербалізацыі зыходнага збіраемага матэрыялу. Яе вынікі – палявыя дадзеныя – затым кладуцца ў аснову ўсіх далейшых трансфармацый, якія і складаюць фонд фальклорна-этнаграфічных ведаў [1]. Гэты артыкул напісаны менавіта на аснове палявых дадзеных, сабраных аўтарам і яе калегамі ў розных рэгіёнах Беларусі.

Назіранні за прыродай, вопыт, веды аб навакольным асяроддзі ў значнай ступені былі зафіксаваны ў народным календары беларусаў, які арганізоўваў жыццядзейнасць селяніна дзень за днём на працягу года, адлюстроўваў цыклічнасць часу, паўтор сезонаў і месяцаў года, кліматычных умоў кожнага з іх і ў якім працоўныя будні рытмічна чаргаваліся са святамі.

Саракі ў народным календары беларусаў адзначаюцца 22 сакавіка. Паводле праваслаў-

нага календара гэта Дзень святых сарака вялікамучанікаў Севасцейскіх. Як і ў іншыя святочныя дні, вяскоўцы на Саракі ўстрымліваліся ад працы, што было праяўленнем шанавання святога дня. Абрадава-песенны комплекс, што суправаджаў гэтае свята ў мінулым, павінен быў садзейнічаць наступленню вясны, набліжэнню цяпла і святла, абуджэнню прыроды і яе жыццядайных сіл. Паводле традыцыйных уяўленняў, Саракі адкрывалі вырай, адкуль чакаўся прылёт птушак, якія лічыліся пасярэднікамі паміж зямлёй і раем, выраем, паміж гэтым і тым светамі. У народных вытлумачэннях сорак птушак супастаўляюцца з сарака пакутнікамі: «Сорак птушачак прыляціць – сорак мучанікаў, яны здалёка лятуць, з-за мора» (в. Воўкаўшчына, Маладзечанскі раён, Мінская вобласць) [2]. Для сустрэчы прылёту «сарака выраяў» гаспадыні выпякалі з цеста фігуркі птушак, што мелі адмысловыя назвы: гракі, са(–о)ракі, сарокі, жаўранкі, галубкі, галубы, вароны і інш. Печыва на Саракі – адзін з яскравых атрыбутаў, маркераў гэтага свята, інфарманты найчасцей згадваюць пра яго ў сваіх аповедах, памятаюць падрабязныя рэцэпты «птушак», клёцак, піражкоў, некаторыя гатуюць іх і сёння для сваіх унукаў. У паўночна-ўсходніх раёнах Гомельшчыны абрадавае печыва на Саракі магло насіць назву каткоў, коцікаў. Выпечаныя фігуркі давалі дзецям, якія з імі ўзлазілі на ўзвышшы, дрэвы ці прымацоўвалі іх на плот, пакідалі на праталінах. Пры гэтым яны гукалі вясну, падкідвалі «птушак» угору, імітуючы прылёт сапраўдных, і крычалі: «Жаўранкі ляцяць!». «На Саракі пяклі жаўраначкаў такіх маленькіх, вочкі сдзелаем с канапеляк, дзюбкі. Угашчалі дзетак усіх. Тады гушкалі <птушак> на скацерцы: «Жавароначкі, прыляціця, стару зіму праганіця…». І падкідвалі ўверх птушак, і дзеці, і ўзрослыя» (Галіна Брыкава, 1941 г.н., в. Стары Дзедзін, Клімавіцкі раён, Магілёўская вобласць); «На Саракі, гаворюць, сорак птушак прілятае. Абізацільна нада была спеч там каго ты ўмееш: сароку, і жаўранка – сорак штук. Дзеці гулялі з етымі птушачкамі, падкідвалі іх. Падвешвалі іх на дзяреўя, вешалі на кусты на нітачцы для настаяшчых птушачак» (Таццяна Зайцава, 1910 г.н., в. Пушкі, Лёзненскі раён, Віцебская вобласць).

Найбольш распаўсюджанай формай гэтых «птушак», асабліва на Магілёўшчыне, паводле ўспамінаў вясковых жыхароў, была наступная: іх выраблялі з распасцёртымі крыламі, як бы ў палёце: «На Сорокі мы яшчэ малыя дзелалі і галубцы, і гракоў, і варон, і крылышкі ім дзелалі, і дзюбкі, усякая ім дзелалі. С жытнёвага цеста дзелалі, панаставіш на скавараду, каб не разваліліся» (Кацярына Мельнікава, 1926 г.н., в. Горы, Горацкі раён, Магілёўская вобласць). Паводле традыцыйных уяўленняў беларусаў, у гэты святочны дзень дзеці нашча зранку мусілі з'есці па адной «птушцы-сарачанцы», каб быць здаровымі і паспяховымі цэлы год. На Віцебшчыне стараліся як мага хутчэй з'есці атрыманую на Саракі птушку, «тады будзеш так шыбка хадзіць, як птушка лятаець»; дзяўчаты ж з'ядалі яе, седзячы на ганку, «каб спіна не балелі ў час жніва». Таксама ўжыванне абрадавага печыва на Саракі спрыяла, паводле вераванняў беларусаў, паспяховаму пошуку яек дзікіх качак і гусей летам, што было значнай падмогай у харчаванні многіх сялянскіх сем'яў. З гэтай жа мэтай – знаходжання яек – у некаторых лакальных традыцыях давалі хлапчукам посуд з сарака зваранымі клёцкамі і загадвалі ім да ўсходу сонца аббегчы ў адной кашулі кругом хаты тры разы і пры гэтым есці клёцкі.

У дзень свята гэтыя мучныя вырабы выкарыстоўваліся ў якасці падарункаў для дзяцей, якія здзяйснялі абыход двароў аднавяскоўцаў: «А дзеці тады прыхадзілі, як на Паску за яйцамі за крашанымі, так на Сорокі за жаўранкамі за этымі хадзілі, у другія хаты. Ім давалі, яны пойдуць у другую хату. Глядзіш ужо: адны выходзяць, другія заходзяць, і раздавалі. А на Сорокі нічога не пелі, прыдуць: «Здрасьце» – «Здрасьце», стаіць дзіцёнак у парозе. Мамка ўжо вынесець пару галушачак, жаўранка этага, і ён пабег» (Ніна Камарова, 1941 г.н., в. Кісялёва Буда, Клімавіцкі раён, Магілёўская вобласць). Акрамя дзяцей, згодна з анімістычнымі ўяўленнямі, уласцівымі традыцыйнаму светасузіранню беларусаў, на Саракі печыва/дары (іх пакідалі на дрэвах, стаўпах, каля вады) атрымлівалі прадстаўнікі звышнатуральных сіл, розныя духі, што насялялі навакольны свет і тагасвет у цэлым.

Акрамя «птушак» на Беларусі гатавалі яшчэ сорак клёцак, піражкоў ці аладак з цёртай бульбы або мукі, з якімі былі звязаны вераванні аб тым, што пасля Саракоў будзе яшчэ сорак замаразкаў, і пры кожным чарговым трэба з'есці адзін гэты выраб, а пасля палічыць:

колькі клёцак/піражкоў засталося – столькі павінна яшчэ быць замаразкаў. Пры дапамозе абрадавага печыва варажылі – знайсці запечаную ў сарачанцы капейку прадказвала шанцаванне на ўвесь год: «Маленькіх галушачак накатаюць, і ў адну клалі капеечку. І вот пяць членаў сям'і – на пяць кучачак раскладуць. Кажды сваю бярець кучку: хто капеечку найдзець – той шчасьлівы» (Марыя Макаранка, 1946 г.н., в. Ліпаўка, Хоцімскі раён, Магілёўская вобласць). На Брэстчыне частку мучных вырабаў «галеп» пакідалі, і хто першы ўбачыць бусла, той выходзіў да яго насустрач са словамі: «Бацян, бацян! На табе галепу, дай мне жыта капу». Людзі больш сталага веку пакідалі «галепы» да вясны/лета і з імі рабілі першае заворванне і першае зажынанне хлеба. У некаторых лакальных традыцыях абрадавае печыва, як і іншыя сакральныя прадметы, захоўвалася за абразамі і выкарыстоўвалася як абярэг ад грому і маланкі.

У абрадавых дзеяннях і народных павер'ях, звязаных з гэтым святам, абыгрывалася лічба «сорак»: «На Саракі трэба было спячы сорак птушак, сорак вяровак парваць, сорак трэсак і сорак дравін прынесці ў хату». Па ўсёй Беларусі адным з устойлівых элементаў Саракоў быў звычай перакідвання праз страху трэсак, скіраваны на поспех у знаходжанні яек. Хлопчыкі басяком раненька, да сонца, нашча, выбягалі на двор і спрабавалі перакінуць праз страху сорак трэсачак. Гэта рабілі яны для таго, каб летам мець поспех у адшукванні птушыных гнёздаў: «Нада была басяком выбягаць на вуліцу сабіраць трэскі, і кідаць іх на крышу. Сколька накідаюць трэсак, тады прыляцяць пціцы на балота, сколька трэсак – столька насабіраеш яіц на балоце» (Іосіф Ільюшчыц, 1926 г.н., в. Рог, Салігорскі раён, Мінская вобласць). У некаторых раёнах зафіксаваны звычай варажыць пры дапамозе трэсак, якія раніцай да ўзыходу сонца прыносілі ў хату і лічылі: калі трэсак аказвалася сорак штук, гэта прадказвала, што летам знойдзеш сорак птушыных гнёздаў з яйкамі качак або гусей.

Дзяўчаты раніцай на Саракі разрывалі сорак вяровачак ці матузкоў або разламвалі сорак дошчачак, што, паводле традыцыйных вераванняў, спрыяла вызваленню зямлі з зімовага палону і хутчэйшаму надыходу цёплых вясновых дзён. Моладзь ладзіла ў гэты дзень арэлі і гушкалася, меншыя гойданкі рабіліся і для дзяцей.


Птушкі на Сараці


Птушкі для гукання вясны


Птушкі для гукання вясны


Птушка-сарачанка


Печыва на Сараці. Фота А. Лянкевіча


Шчэпавая птушка-абярэг.
Бярозаўскі раён. Фота Т. Кухаронак



На Сaракі. Любанскі раён, Мінская вобласць. Фота С. Выскваркі

Гушканне на арэлях на Саракі, згодна з народным меркаваннем, садзейнічала здароўю чалавека, яго ачышчэнню; спрыяла росту ільну: лічылася, чым вышэй будзеш калыхацца – тым вышэйшы вырасце лён. У сучасных наратывах вясковых жыхароў яно ўзгадваецца як вясёлая дзея, а з яе магічных складнікаў захавалася пажаданне таго, каб улетку не кусалі камары: «Мы гушкаліся на Саракі, гушкалку павесім і гушкаемся. Бывала, былі гумны і бальшыя пуні, сабіраліся, хлопцы бяруць вяроўкі і робяць гушкалку такую. Вяроўкі за балькі, а тады доску кладуць бальшую, абкручваюць яе, увязваюць і па баках станавяцца, а тут сядзяць і гушкаюць. Гушкаліся, каб камары ўлетку ня елі» (в. Стараселле, Крупскі раён, Мінская вобласць) [2]. Папулярнымі ў гэты дзень былі і скаканні дзяўчат на дошках, бо, згодна з міфалагічнымі ўяўленнямі, здольнасць дзяўчыны зламаць сорак такіх дошак паказвала на яе гатоўнасць да шлюбу. Права на такі від забаў-выпрабаванняў мелі толькі тыя дзяўчаты, што ўваходзілі ва ўзрост нявест, прычым удалае скаканне прадказвала будучыя поспехі. У сваю чаргу хлопцы гэтаксама праходзілі сваё выпрабаванне на гатоўнасць да шлюбу – мусілі збіць сорак краглёў: «Сорак краглёў ужо трэба выбіць. Гульня такая была ў «Краглі»: атразалі такія дзеравянныя кусочкі, як на жэрдку, іх складалі хаткай, усякімі такімі ігрушкамі. А другія хлопцы палкамі выбівалі. Палкай размахвае і кідае той палкай, штоб выбіць тых сорак краглёў» (в. Дуброўнае, Брагінскі раён, Гомельская вобласць) [2]. У многіх лакальных традыцыях на Саракі гукалі вясну. Вечарам хлопцы і дзяўчаты збіраліся на танцы, частаваліся півам, якое спецыяльна варылася да гэтага свята.

Саракі ў каляндарным коле пазначалі сабою кліматычны рубеж («Саракі гоняць снег да ракі»), якія сігналізавалі аб хуткім наступленні вясны. Сталыя людзі, як і заўсёды на каляндарныя святы, назіралі за надвор’ем, бо лічылася: якое надвор’е на Саракі – такое застанецца на сорак наступных дзён. Сяляне прыкмячалі: калі, напрыклад, за тыдзень да Саракоў прыляціць жаўранак – то пасля Саракоў ён схаваецца і тыдзень будзе сядзець, бо халоднае надвор’е будзе; калі на Саракі мяцеліца – чакаецца вясна зацяжная, павымяце, кажуць, з пунь, адусюль; не будзе ні сена, ні хлеба ў засеках [2]. «На Саракі выходзіш раненька і глядзіш, куды дым ідзе с коміна, у які бок, ці на запад, ці на ўсход, гэта значыць, цёплае лета будзе ці халоднае. У нас калі з усходу вецер, дак у нас тады зімна, кажам дзярбуны, а як з захаду – тады цёпла будзе» (Марыя Буцько, 1939 г.н., в. Валэйкавічы, Смаргонскі раён, Гродзенская вобласць). Выконвалі разнастайныя абрады, каб забяспечыць будучы добры ўраджай, здароўе сабе і дзецям. Так, стукалі ў вулей, і калі з вулея вылеціць пчала, лічылі: будзе добрае лета. Рассыпалі па дарозе жыта і пілавінне ў надзеі на добры ўраджай і багацце лесу. Кідалі саломай у сцяну хаты: колькі стукнецца саломінак аб яе – столькі, лічылася, курыца знясе яек у годзе.

Каляндарныя святы з’яўляліся як бы прыпынкамі-перапынкамі ў бясконцым руху часу. Кожнае з іх сімвалізавала сабой пачатак новага жыцця, было перыядам часу, што злучаў мінулае, цяперашняе і будучае. Народны каляндар вучыў, засцерагаў, нагадваў. Правільнае выкананне на Саракі ўсіх патрэбных абрадаў, забаронаў, прыкмет надавала чалавеку ўпэўненасці, што ў будучым вырасце добры ўраджай, у сям’і будзе лад, здароўе, заможнасць, дачка ці сын возьмуць шлюб, народзяць здаровае дзіця. И

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**


1. Щепанская Т.Б. Полевик: фигура и деятельность этнографа в экспедиционном фольклоре (опыты автоэтнографии) // Журнал социологии и социальной антропологии. 2003. Т.VI. №2. С. 165–179.
2. «Ядраное жыта гаспадара кліча…»: каляндарны год у абрадах і звычаях / Т.В. Валодзіна, Т.І. Кухаронак. – Мінск, 2015.